С.В. Венідзіктаў С.І. Даніленка

Беларуская мова
Юрыдычная лексіка

Для студэнтаў
устаноў
вышэйшай адукацыі

С.В. Венідзіктаў С.І. Даніленка

Беларуская мова
Юрыдычная лексіка

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка
для курсантаў і студэнтаў
устаноў вышэйшай адукацыі
па юрыдычных спецыяльнасцях

Мінск
«Вышэйшая школа»
2019

УДК 811.161.3’373(075.8):34
ББК 81.2Беи-922
В29

Р э ц э н з е н т ы: кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова” (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Я.Я. Іваноў*); загадчык кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Максіма Танка” кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Д.В. Дзятко*

Венідзіктаў, С. В.

В29 Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэбны дапаможнік / С. В. Венідзіктаў, С. І. Даніленка. – Мінск : Вышэйшая школа, 2019. – 127 с. : іл.
ISBN 978-985-06-2999-9.

Змяшчае тэарэтычны матэрыял па ўсіх раздзелах курса “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)”. Для засваення і замацавання тэарэтычнага матэрыялу, павышэння культуры маўлення прапануюцца практычныя заданні, якія маюць выразную прафесійную (юрыдычную) накіраванасць.

Выданне ўтрымлівае шэраг спецыяльных тэкстаў юрыдычнай тэматыкі і ўзоры службовай дакументацыі для перакладу, кароткі руска-беларускі слоўнік юрыдычных тэрмінаў, тэсты і заданні для самакантролю.

Для курсантаў і студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных спецыяльнасцях. Будзе карысны выкладчыкам і ўсім, хто цікавіцца беларускай мовай.

УДК 811.161.3’373(075.8):34
ББК 81.2Беи-922

Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва.

ISBN 978-985-06-2999-9

© Венідзіктаў С.В., Даніленка С.І., 2019
© Афармленне. УП «Выдавецтва “Вышэйшая школа”», 2019

ПРАДМОВА

Мэты і змест дысцыпліны “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)” арыентуюцца найперш на практычныя патрэбы грамадства. Для студэнтаў юрыдычных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і курсантаў устаноў адукацыі сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў прынцыпова важнай з’яўляецца здольнасць вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Выкладанне дысцыпліны “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)” мае на мэце выпрацоўку і замацаванне практычных уменняў і навыкаў карыстання вуснай і пісьмовай мовай, развіццё моўна-эстэтычнага густу, пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў органаў унутраных спраў. Важнай задачай вучэбнага курса з’яўляецца выпрацоўка ўменняў практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці і падрыхтоўка да практычнага ўкаранення атрыманых ведаў у іншых сферах сацыяльнай актыўнасці. У працэсе авалодання дысцыплінай студэнты павінны бліжэй пазнаёміцца з духоўнай і інтэлектуальнай спадчынай беларускага народа, развіць пачуццё нацыянальнай самапавагі.

Курс уключае шаснаццаць практычных заняткаў па сямі тэмах.

Тэма 1 адведзена высвятленню месца і ролі беларускай мовы ў сістэме гуманітарных ведаў сучаснага чалавека. У тэме 2 пададзена вызначэнне асноўных катэгорый лексікалогіі, асаблівасцей лексікі паводле паходжання, ступені і сферы ўжывання; асобная дэталізацыя робіцца ў адносінах да тэрміналагічнай сістэмы сучаснай юрыдычнай навукі. Тэма 3 складаецца з чатырох практычных заняткаў, у яе межах вывучэнне юрыдычнай тэрміналогіі працягваецца ў суаднясенні і параўнанні беларускай і рускай моў, што мае практычную патрэбу. Па-першае, зараз у нашай краіне суіснуюць дзве дзяржаўныя мовы — беларуская і руская. Па-другое, абедзве мовы паралельна вывучаюцца ў школах, каледжах, установах вышэйшай адукацыі, таму супастаўленне дапамагае больш глыбокаму, асэнсаванаму засваенню асаблівасцей беларускай юрыдычнай тэрміналогіі. У тэме 4 даецца агульнае паняцце аб сістэме функцыянальных стыляў. Заняткі па тэме 5 узнаўляюць і сістэматызуюць веды навучэнцаў адносна навуковага стылю, яго сферы выкарыстання і найбольш ужывальных дакументаў. Тэма 6 прысвечана дэталёваму вывучэнню афіцыйна-дзелавога стылю, яго моўных асаблівасцей (лексічных, граматычных, сінтаксічных), адметнасцей перакладу тэкстаў юрыдычнай тэматыкі. Пры гэтым навыкі складання справавых лістоў і патрабаванні да іх афармлення студэнты і курсанты засвойваюць самастойна. Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)” завяршаецца разглядам тэмы 7 “Культура прафесійнага маўлення”, у межах якой вывучаюцца галоўныя камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагіч-

насць, чысціня і багацце маўлення, дарэчнасць, вобразнасць), асноўныя моўныя нормы, разглядаюцца праблемы тэхнікі і выразнасці маўлення, падрыхтоўкі публічнага выступлення.

Шэраг пытанняў, сярод якіх этапы фарміравання беларускай мовы, гісторыя развіцця беларускай навуковай тэрміналогіі, тэрміналагічная лексікаграфія, сінтаксічная стылістыка, кампазіцыйна-структурная арганізацыя навуковага стылю, узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў маўленчай дзейнасці і іншыя, выносіцца на самастойны разгляд. Засваенне дысцыпліны прадугледжвае таксама досыць вялікі аб'ём самастойнай працы навучэнцаў па перакладу тэкстаў юрыдычнай тэматыкі і складанню слоўніка юрыдычнай тэрміналогіі.

Такім чынам, у выніку засваення вучэбнай дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" студэнты павінны:

1) ведаць:

- ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;
- функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;
- месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;
- сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;
- дастаткова поўны набор прафесійнай лексікі;
- тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

2) умець:

- граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай;
- правільна разумець прафесійныя тэксты і ўспрымаць навуковую галіновую інфармацыю;

3) мець навыкі:

- перакладу, анатавання і рэферыравання прафесійна арыентаваных тэкстаў;
- складання і вядзення на беларускай мове дзелавой дакументацыі, падрыхтоўкі навуковых і публічных выступленняў.

Тэма 1

Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)”. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 1.1

Пытанні

1. Мэта і задачы курса.
2. Мова і соцыум.
3. Функцыі мовы ў грамадстве.
4. Гіпотэзы паходжання мовы.

ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА

Мэта і задачы курса

Мэты выкладання дысцыпліны:

• выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі карыстання вуснай і пісьмовай мовай;

• развіць моўна-эстэтычны густ, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы;

• пашырыць і ўзбагаціць прафесійны лексічны запас будучых правазнаўцаў і спецыялістаў органаў унутраных спраў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;

• падрыхтавацца да практычнага ўкаранення атрыманых ведаў у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

• развіць павагу да інтэлектуальнай і духоўнай спадчыны беларускага народа, імкненне да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

Задачы вывучэння дысцыпліны “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)” студэнтамі юрыдычных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і курсантамі ўстаноў адукацыі сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў:

• усвядоміць неабходнасць ведання і карыстання беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;

• атрымаць сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;

• усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;

• стаць высокаадукаванымі спецыялістамі, здольнымі вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Мова і соцыум

Сучасная навука, вызначаючы сутнасць мовы, вырашае пытанне, што ёсць мова – біялагічная, індывідуальная (псіхічная) ці сацыяльная (грамадская) з'ява. Мову лічаць з'явай сацыяльнай, бо яна не перадаецца генетычна, ад старэйшых да маладзейшых, як біялагічныя адзнакі (колер скуры, валасоў, форма твару). Дзіця авалодвае мовай таго калектыву (соцыуму), у якім расце і выхоўваецца. Па-за людской супольнасцю дзіця наогул не можа навучыцца размаўляць.

Мова не ёсць і чыста індывідуальная з'ява, бо ў такім разе кожны чалавек меў бы сваю мову (узгадаем легенду пра Вавілонскую вежу).

Мова асобнага чалавека развіваецца толькі ў соцыуме, пад уздзеяннем калектыву. Такім чынам, мова – гэта з'ява сацыяльная, а не біялагічная, індывідуальная.

Зносіны ў шырокім сэнсе слова існуюць не толькі ў чалавечым грамадстве, але і ў жывёльным свеце, а ў нашы дні мы таксама павінны ўлічваць зносіны чалавека з машынай. Ва ўсіх выпадках зносіны ёсць перадача нейкай інфармацыі, спецыяльна ці адвольна дасланай адпраўшчыкам і ўспрынятай атрымальнікам. Аналізуючы факты ці працэсы зносін, неабходна размяжоўваць у іх два планы: выяўленне, дакладней спосаб ці форму выяўлення (напрыклад, кончык хваста ў кошкі ці літара для абазначэння гука), і змест, які стаіць за перададзенай інфармацыяй.

У жывёл зносіны грунтуюцца галоўным чынам на рэакцыях, што перадаюцца ў спадчыну. Кожны раз, калі адбываюцца зносіны, яны залежаць ад прысутнасці стымулу ў канкрэтнай сітуацыі. Так, жывёла, якая заўважае пагрозу, пачынае крычаць і тым самым папярэджвае аб небяспецы ўсіх астатніх. Але гэты крык абумоўлены не ўсвядомленым намерам перадаць адпаведную інфармацыю, а міжвольнай рэакцыяй на ўзнікшае пачуццё страху. Паводзіны як адпраўшчыка, так і атрымальніка не выходзяць тут за межы "першай сігнальнай сістэмы".

Чалавечыя зносіны – феномен, які якасна адрозніваецца ад таго, што мы заўважаем у свеце жывёл. Чалавечыя зносіны ажыццяўляюцца галоўным чынам з дапамогай гукавой мовы. Разам з тым значную ролю ў зносінах паміж людзьмі адыгрываюць і невербальныя формы, у сваіх вытоках агульныя для чалавека і жывёлы.

Моўныя зносіны складаюць "другую сігнальную сістэму рэчаіснасці", якая надбудоўваецца над першай, агульнай для чалавека і жывёлы. Моўныя зносіны заўсёды грунтуюцца на засваенні (стыхійным або свядомым) дадзенай мовы, набытых ведаў удзельнікамі зносін.

За рэдкім выключэннем моўныя зносіны носяць мэтанакіраваны характар і, што вельмі важна, ажыццяўляюцца не толькі як прамая рэакцыя на непасрэдны стымул. Гэта азначае, што, карыстаючыся мовай, можна абстрагавацца ад сітуацыі, гаварыць пра тое, чаго ў дадзеную хвіліну няма, аб мінулым і будучым, абагульняць і будаваць дапушчэнні. Моўныя зносіны – гэта не проста паведамленне якіх-небудзь фактаў ці перадача звязаных з імі эмоцый, але і абмен думкамі наконт гэтых фактаў.

Мова – агульнанародны набытак. Узорны варыянт агульнанароднай мовы – літаратурная (унармаваная) мова. Дыялекты – мясцовыя разнавіднасці агульнанароднай мовы.

Сацыяльныя адгалінаванні: прафесіяналізмы (спецыяльныя словы і выразы пэўных галін вытворчасці і навукі), прафесійныя арго (неафіцыйныя абазначэнні тых ці іншых паняццяў адпаведнай галіны вытворчасці), арго дэкласаваных элементаў, маладзёжны слэнг.

Індывідуальны варыянт мовы называюць ідыялектам.

Функцыі мовы ў грамадстве

Мове як сацыяльнай з'яве належаць наступныя функцыі:

1) камунікатыўная (лац. *communicatio* – паведамленне, сувязь, дачыненне) – асноўная функцыя, бо мова з'яўляецца сродкам зносін у грамадстве;

2) думкафармавальная (мова выступае ўтваральным органам думкі);

3) пазнавальная (кагнітыўная): чалавечае пазнанне грунтуецца на ведах, якія фіксуюцца, назапашваюцца, абагульняюцца з дапамогай мовы. Засвойванне назапашаных чалавецтвам ведаў, практычна ўсе працэсы навучання людзей (у школах, ВНУ і г.д.) звязаны з шырокім выкарыстаннем мовы, якая служыць галоўным сродкам атрымання, павелічэння, узбагачэння ведаў;

4) называльная (намінатыўная), дзякуючы якой знешнія прадметы становяцца ўнутраным здабыткам чалавека, ствараюць свет яго вобразаў, уяўленняў, пачуццяў, атрымліваючы назвы сродкамі мовы, у першую чаргу словамі;

5) экспрэсіўная: мова з'яўляецца і галоўным спосабам выражэння думак і пачуццяў кожнага чалавека;

6) эстэтычная функцыя мовы ўвасабляецца ў мастацкай прозе, паэзіі, сцэнічным маўленні, красамоўстве.

Гіпотэзы паходжання мовы

Гіпотэза гукапераймання была ўпершыню выказана Дэмакрытам і Платонам. Згодна з ёй мова ўзнікла ў выніку таго, што чалавек пераймаў гукавыя прыметы прадметаў. У гэтай тэорыі вылучаюць:

- уласна гукапераймание (*ква-ква*, *хлоп*, *бац*);
- гукасімвалізм (*боб*, *бублік* – губныя гукі для абазначэння нечага круглага).

Гіпотэза выклічнікаў разглядалася Эпікурам, Ч. Дарвінам, А. Патабнёй. Гэтая гіпотэза тлумачыць узнікненне мовы як рэакцыю чалавека на боль, страх, радасць. Пры гэтым свой эмацыянальны стан чалавек выражаў з дапамогай не толькі гукаў, але і жэстаў.

Працоўная тэорыя: мова ўзнікла ў працэсе працоўнай дзейнасці. Пры гэтым мысленне і дзеянне былі непарыўна звязаны, працоўныя выкрыкі ў час сумеснай працы станавіліся сімваламі пэўных працэсаў і дзеянняў. Працоўная тэорыя была развіта гіпотэзай Ф. Энгельса, якая была выкладзена ім у працы "Роля працы ў працэсе пераўтварэння малпы ў чалавека". Спачатку праца, а потым і членараздзельнае маўленне з'явіліся двума галоўнымі стымуламі, пад уплывам якіх мозг малпы паступова пераўтварыўся ў чалавечы мозг. Калі чалавек пачаў працаваць, ён стаў хадзіць прама, у яго вызваліліся рукі. Развіццё рук напрамую звязана з развіццём мозгу: левага паўшар'я і правай рукі (у левым паўшар'і знаходзяцца так званыя зоны Брака і Верніке, якія адказваюць за спараджэнне і ўспрыняцце мовы) і, адпаведна, правага паўшар'я і левай рукі. Акрамя таго, пачаў анатамічна развівацца галасавы апарат.

ПРАКТЫЧНАЯ ЧАСТКА

1. Напісанне кантрольнай тэкставай дыктоўкі.

Паказчыкі ацэнкі кантрольнай тэкставай дыктоўкі:

Балы	Колькасць памылак									
10	0/0	Чыста, без выпраўленняў								
9	0/1*	1*/0	Або 1–2 выпраўленні							
8	0/1	1/0	Або 3 выпраўленні							
7	0/2 0/3	1/2	2/0 2/1	Або 4 выпраўленні						
6	0/4	1/3	2/2	3/0 3/1						
5	0/5	1/4	2/3	3/2	4/0 4/1					
4	0/6	1/5	2/4	3/3	4/2	5/0 5/1				
3	0/7 0/8	1/6 1/7	2/5 2/6	3/4 3/5	4/3 4/4	5/2 5/3	6/0 6/1 6/2	7/0 7/1	8/0	
2	0/9 0/10	1/8 1/9	2/7 2/8	3/6 3/7	4/5 4/6	5/4 5/5	6/3 6/4	7/2 7/3	8/1 8/2	9/0 9/1
1	Больш, чым на 2 балы									

* Два выпраўленні = адна памылка.

Пытанні для самастойнага разгляду

1. Канцэпцыі паходжання беларускай мовы.
2. Дзяржаўны статус старабеларускай мовы ў ВКЛ.
3. Гістарычны ўплыў польскай і рускай моў на развіццё беларускай мовы.
4. Асноўныя этапы рэфармавання беларускай мовы ў XX ст.
5. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XXI ст.

Пытанні для самакантролю

1. Чаму мову лічаць сацыяльнай з'явай?
2. Што такое "другая сігнальная сістэма"?
3. Чым літаратурная мова адрозніваецца ад дыялектнай?
4. Якія функцыі выконвае мова ў грамадстве? Якая функцыя мовы лічыцца асноўнай?
5. Раскрыйце змест гіпотэзы гукапераймання, гіпотэзы выклічнікаў і працоўнай тэорыі, якія тлумачаць з'яўленне і развіццё мовы ў грамадстве.
6. Назавіце асноўныя канцэпцыі паходжання беларускай мовы.
7. Чым забяспечваўся дзяржаўны статус беларускай мовы ў ВКЛ?
8. Як сказаліся на развіцці сучаснай беларускай мовы працэсы паланізацыі і русіфікацыі?
9. Раскрыйце асноўныя кірункі моўных рэформ савецкага часу.
10. Якія заканамернасці назіраюцца ў развіцці і функцыянаванні беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XXI ст.?

Тэма 2

Лексічная сістэма беларускай мовы

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 2.1

Пытанні

1. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная).
2. Лексіка беларускай мовы паводле ступені ўжывання.
3. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання.

ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная)

У складзе лексікі беларускай мовы вылучаюцца дзве вялікія групы слоў:

1) спрадвечна беларускія;

2) запазычаныя.

Спрадвечна беларуская лексіка ўключае чатыры пласты слоў:

- індаеўрапейскія;
- агульнаславянскія;
- усходнеславянскія;
- уласнабеларускія.

Запазычаную лексіку складаюць словы, што трапілі ў беларускую мову:

- са славянскіх моў;
- з неславянскіх моў (мал. 1).

Аснову сучаснай лексікі складаюць спрадвечна беларускія словы, якія існуюць у беларускай мове з даўніх часоў, пераходзілі з пакалення ў пакаленне. Адны з іх дайшлі да нас з індаеўрапейскай эпохі, другія — з часу агульнаславянскага адзінства, трэція належаць да агульнаўсходнеславянскага перыяду, іншыя (уласнабеларускія) узніклі ў эпоху фарміравання мовы беларускай народнасці і нацыі.

Індаеўрапейскія словы ўзніклі ў індаеўрапейскай прамове ў перыяд так званага індаеўрапейскага этнічнага адзінства (IV тысячагоддзе да н.э.). Гэта назвы:

1) роднасці і сваяцтва: *брат*, *дзед*, *зяць*, *мама*, *сын*, *сястра*;

2) органаў і частак цела чалавека і жывёлы: *брыво*, *зуб*, *калена*, *кроў*, *нага*, *нос*;

ЗМЕСТ

Прадмова 3

Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова (юрыдычная лексіка)”. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей 5

Тэма 2. Лексічная сістэма беларускай мовы 10

Тэма 3. Функцыянаванне беларускай мовы ў сітуацыі білінгвізму 22

Практыкаванні для прамежкавага кантролю 40
Тэсты для прамежкавага кантролю 42

Тэма 4. Функцыянальныя стылі маўлення 54

Тэма 5. Навуковы стыль 57

Тэма 6. Афіцыйна-справавы стыль 66

Тэма 7. Культура прафесійнага маўлення 71

Тэксты для перакладу 86

Узоры службовай дакументацыі 102

Кароткі руска-беларускі слоўнік юрыдычных тэрмінаў 108

Літаратура 126

Вучэбнае выданне

Венідзіктаў Сяргей Віктаравіч
Даніленка Сяргей Іванавіч

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Юрыдычная лексіка

Вучэбны дапаможнік

Рэдактар *Л.М. Макейчык*
Мастацкі рэдактар *Т.В. Шабунько*
Тэхнічны рэдактар *Н.А. Лебядзевіч*
Карэктар *А.І. Галдзянкова*
Камп'ютарная вёрстка *М.У. Гарэцкай*

Падпісана ў друк 15.02.2019. Фармат 60×90/16. Папера афсетная.
Гарнітура «Newton». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 8,0.
Ул.-выд. арк. 8,81. Тыраж 400 экз. Заказ 213.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Вышэйшая школа"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/3 ад 08.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
e-mail: market@vshph.com http://vshph.com

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/42 ад 13.02.2014.
Вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск.